**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у красакавіку**

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.**

**2 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшла гутарка для вучняў 1 класа "В единстве наша сила". Дзеці адправіліся ў віртуальную вандроўку па дзвюх краінах: Расіі і Беларусі. У гульнявой форме вучні знаёміліся з культурай, бытам, дзяржаўнымі сімваламі краін.

**2 красавіка. ЦДБ.** Адбыўся вусны журнал "В единстве наша сила". Дзеці даведаліся пра гісторыю свята і яго вытокі, пра тое, што нашы брацкія народы аб'ядноўвае свабодалюбства, імкненне да адзінства, міру, сяброўства. Пазнаёміліся з дзяржаўнымі сімваламі Беларусі і Расіі, падабенствам і адрозненнем паміж рускай і беларускай мовамі.

**4 красавіка. ЦБ.** У бібліятэцы адбыўся тэлемост з цэнтральнай бібліятэкай г.Палеска (РФ). У анлайн-сустрэчы прынялі ўдзел бібліятэкары гарадоў-пабрацімаў і ўдзельнікі літаратурных аб'яднанняў "Литературная провинция" (Лунінец) і "Высокая строфа" (Палеск). У рамках сустрэчы ўдзельнікі павіншавалі адзін аднога са значным для нашых народаў днём. Удзельнікі аматарскіх аб'яднанняў чыталі вершы на рускай і беларускай мовах. Гэты фармат святкавання дазволіў пераадолець адлегласці і ўмацаваць культурныя сувязі дзвюх краін.

Прайшлі мерапрыемствы **да 220-годдзя** з дня нараджэння **Ганса Хрысціяна Андэрсэна**, дацкага пісьменніка. Так **2 красавіка**, у **ЦДБ** у рамках клуба "Читайки» адбылася літаратурная гадзіна "В стране героев Ганса Христиана Андерсена", у **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** для дзяцей арганізавалі агляд навінак дзіцячай літаратуры «Новинки из книжной корзинки», у **Рэдзігераўскай с.б.** прайшоў казачны калейдаскоп «Андерсен и его сказки».

Да **Дня здароўя** у бібліятэках прайшлі акцыі, пазнавальныя гадзіны, урокі здароўя па прапагандзе здаровага ладу жыцця.

**4 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Для ўдзельнікаў клуба "САМІ" правялі пазнавальную гадзіну "Здоровье на тарелке". На пачатку мерапрыемства бібліятэкар расказала прысутным аб здаровым ладзе жыцця, аб правільным харчаванні, аб фізічнай актыўнасці. Далей прапанавалі віктарыну, конкурс загадак і ўсе разам склалі карыснае меню. У завяршэнні мерапрыемства ўдзельнікі чыталі вершы аб здаровым ладзе жыцця.

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, **5 красавіка** ў **Рэдзігераўскай с.б**. прайшоў урок здароўя "Как стать Неболейкой», у **Сінкевіцкай с.б.** прайшла інфармацыйная гадзіна з падлеткамі "Как стать здоровым», аб шкодзе курэння і алкаголю на арганізм чалавека і аб карысці заняткаў спортам і здаровага харчавання. **6 красавіка** ў **Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе** адбылася пазнавальная гадзіна "Здоровье - это здорово" і інш.

**8 красавіка. ЦБ.** У гонар свята Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы ў духоўна-асветніцкім цэнтры "Истоки" адбыўся ўрок праваслаўнай культуры

“Приносите в свет добро”. Мерапрыемства правялі для пажылых людзей адзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі і забеспячэння дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Лунінецкага ТЦСАН. Настаяцель храма ў гонар Святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага, іерэй Аляксандр Барысаў павіншаваў усіх са святам, расказаў пра гісторыю і сэнс свята і адказаў на пытанні прысутных.

У бібліятэках Лунінецкай РЦБС прайшлі акцыі, вечары памяці, аформлены кніжныя выставы, прысвечаныя **Міжнароднаму дню вызвалення вязней фашысцкіх канцлагерэй.**

**11 красавіка. ЦБ.** Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з пракуратурай Лунінецкага раёна правялі для вучняў школ горада Лунінца патрыятычную гадзіну «Памяти узников концлагерей». Пракурор Лунінецкага раёна Юрый Пракапчук у сваім выступленні расказаў аб рабоце Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь па выяўленні фактаў генацыду ў дачыненні беларускага народу, у прыватнасці жыхароў Лунінеччыны. Галоўны спецыяліст Лунінецкага РГА “БРСМ” правяла віктарыну на патрыятычную тэму. Самыя актыўныя яе ўдзельнікі былі ўзнагароджаны падарункамі.

**10 красавіка. ЦДБ.** Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі правялі літаратурны пазл «Тяжёлая правда войны». Дзяцям расказалі пра створаныя фашыстамі канцлагеры, дзе яны размяшчаліся і для чаго ствараліся. Таксама прысутных пазнаёмілі з кніжнай выставай “Дзеці і вайна”.

**11 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Для вучняў 9 “Б” класа СШ №1 правялі гадзіну гісторыі “Своими видел я глазами”.

Да Сусветнага **дню авіяцыі і касманаўтыкі** ў **Мікашэвіцкай г.б.** правялі шэраг мерапрыемстваў.

**10 красавіка. Мікашэвіцкая г.б**. Для вучняў 8 “В” класа СШ №2 правялі інфармацыйную гадзіну “Беларускія касманаўты”.

**11 красавіка. Мікашэвіцкая г.б**. Для вучняў 8 “Б” класа СШ №2 адбылася тэматычная гадзіна «Белорусские космонавты в космосе».

**15 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Почемучка” правялі краязнаўчую праграму “Путешествие по тропинкам родного края». Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі дзяцей з гістарычным мінулым роднага краю, расказалі пра подзвігі землякоў ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**15 сакавіка. ЦБ**. Прайшоў юбілейны вечар «Листая страницы твои в юбилей», прысвечаны таленавітай паэтэсе Лунінеччыны, ветэрану педагагічнай працы Галіне Сыцінай. Павіншавать Галіну Пятроўну з юбілеем прыйшлі сябры, калегі па літаратурнаму аб’яднанню, госці. Са шчырымі словамі віншавання да юбіляра звярнуўся дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Эдуард Северын. Удзельнікі “Литературной провинции” чыталі свае віншавальныя вершы і выконвалі музычныя нумары. У завяршэнні мерапрыемства Галіна Пятроўна падарыла на памяць прысутным свой новы зборнік вершаў «Мелодия души», які к юбілею паэта быў выданы

супрацоўнікамі сектару маркетынга, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы цэнтральнай бібліятэкі.
**25 красавіка. ЦБ.** Бібліятэка прыняла ўдзел у культурна-асветніцкай акцыі ў падтрымку чытання "Бібліяноч – 2025". Мерапрыемства пад назвай «Не смолкнет память тех великих лет!» прымеркавалі да святкавання 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Увазе чытачоў прапанавалі разнастайныя лакацыі. У духоўна-асветніцкім цэнтры "Вытокі" выступіў настаяцель Спаса-Праабражэнскага храма (в.Язвінкі), пратаірэй Сергій Чыж на тэму "Подзвіг свяшчэннаслужыцеляў на франтах Вялікай Айчыннай вайны". Папулярнасцю карысталася квэст-гульня "Дарогамі Вялікай Айчыннай вайны". Аматары паэзіі прынялі ўдзел у адкрытым мікрафоне "Читаем стихи о войне". Завяршылася праграма бібліяночы літаратурна-музычнай кампазіцыяй "Вайна. Перамога. Памяць", у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі старэйшага пакалення і моладзь. Таксама ў рамках мерапрыемства адбылася прэзентацыя зборніка твораў вядомага пісьменніка і краязнаўцы Лунінецкага раёна Сцяпана Паўлавіча Нефідовіча "Балючая памяць".

Прайшлі мерапроыемствы да **Дня Чарнобыльскай трагадыі.**
**26 красавіка. ЦБ.** Прайшла літаратурна-пазнавальная гадзіна "Чернобыль: дни испытаний". Навучэнцы СШ №1 даведаліся аб гісторыі будаўніцтва і эксплуатацыі ЧАЭС, аб прычынах аварыі. На мерапрыемства запрасілі Андрэя Іванавіча Кіндрука, які расказаў аб рызыках, звязаных з выкарыстаннем атамнай энергіі, аб тым, ці існуе небяспека для жыхароў раёнаў, прылеглых да АЭС, аб розных відах радыяцыі.
**26 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Адбыўся літаратурны вечар "Звон жалобны над краем". У мерапрыемстве прынялі ўдзел члены клуба "Паэтычная глыбінка".